ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)
УДК 94.476+94(44) (091)
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-4-432-442

Паступіў у рэдакцыю 26.07.2019
Received 26.07.2019

**В. А. Пілецкі**

*Мінскі інавацыйны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*

# ПРАБЛЕМА СВЕЦКАСЦІ ВЫХАВАЎЧА-АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ Ў ГІСТОРЫІ І СУЧАСНАСЦІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ БЕЛАРУСІ І ФРАНЦЫІ)

**Аннотация.** Проанализирована проблема светскости воспитательно-образовательного процесса в истории и современности на примере Беларуси и Франции. Показано сущностное отличие «воспитательно-образовательной», светской деятельности школы от конфессионально-воспитательной (доктринальной) деятельности церковных структур. Сделан экскурс в историю борьбы за светскость школьного дела в двух названных регионах. Показаны отдельные вехи становления светской школы на протяжении веков. Подчеркнута сложность этого процесса. Обозначены как периоды успехов, так и досадные примеры откатывания назад к реалиям средневековья, обусловленные чаще политическими факторами.

**Ключевые слова:** христианство, светскость, Конкордат Наполеона, народные училища, «Эдукационная комиссия», гимназии, Великая французская революция, гражданское обустройство духовенства, Положение о реальных училищах, схоластика, изгнание иезуитов, церковно-приходские школы, Устав гимназий

**Для цитирования.** Пілецкі В. А. Праблема свецкасці выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў гісторыі і сучаснасці (на прыкладзе Беларусі і Францыі) / В. А. Пілецкі // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2019. – Т. 64, № 4. – С. 432–442. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-4-432-442

**V. A. Piletsky**

*Minsk Innovative University, Minsk, Belarus*

## PROBLEM OF SECULARITY OF THE EDUCATIONAL PROCESS IN HISTORY AND PRESENT (THROUGH THE EXAMPLES OF BELARUS AND FRANCE)

**Abstract.** The problem of secular educational process in the history and the present on the example of Belarus and France is analyzed. Essential difference between «educational» secular activities and religious-educational (doctrinal) of Church structures is presented. Retrospective journey into the history of struggle for secularism of school affairs in these two regions. Individual milestones in the development of secular schools for centuries are demonstrated. Complexity of the process is emphasized. Both periods of success and unfortunate examples of rolling back to the realities of middle ages, caused more often by political factors, are indicated.

**Keywords**: Christianity, secularism, the Concordat of Napoleon, public schools, education Commission, school, French revolution, civil construction of clergy, Statute on real schools, scholasticism, the expulsion of the Jesuits, parochial schools, Charter of schools

**For citation.** Piletsky V. A. Problem of secularity of the educational process in history and present (through the examples of Belarus and France). *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2019, vol. 64, no. 4, pp. 432–442 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-4-432-442

Праблема свецкасці «*выхаваўча-адукацыйнага працэсу*» (*альбо* «*адукацыйна-выхаваўчага*», у залежнасці ад першаступеннасці задач у кожным канкрэтным гістарычным перыядзе [1, с. 292]) даволі складаная для навуковага аналізу найперш таму, што яна да сённяшніх дзён захоўвае сваю палітычную актуальнасць. Тэрмін «свецкі» тут і далей разумеецца ў сэнсе «не царкоўны», «не духоўны», «грамадзянскі» [2].

Вядома, што важную ролю ў жыцці еўрапейскіх краін нават у XXI ст. адыгрывае сусветная рэлігія хрысціянства, якая мае сваіх шматлікіх прыхільнікаў у розных дзяржавах свету. Царкоўныя структуры каталіцтва і праваслаўя як двух важнейшых хрысціянскіх кірункаў (канфесій) выконваюць выключную ролю ў жыцці еўрапейскага грамадства – дапамагаюць чалавецтву (грамадству і асобна кожнаму чалавеку) у наш даволі складаны перыяд гісторыі, насычаны «высокімі хуткасцямі» (навуковымі, эканамічнымі, інфармацыйнымі, палітыка-ідэалагічнымі і інш.),

© Пілецкі В. А., 2019

заставацца людзьмі і памятаць пра тое, што чалавек (хоць ён і «*цар прыроды*», як некалі гаварылі ў СССР), нягледзячы на яго велізарныя магчымасці ў розных галінах свайго існавання, асабліва ў цяперашнім ХХІ стагоддзі, без «божай падтрымкі» (без веры) часцей за ўсё ператвараецца ў «істоту» альбо «лісціка, які гайдаецца на паветры».

Аўтарытэт хрысціянства ў свеце ўмацоўваецца. Колькасць прыхільнікаў імкліва расце. Нашы сучаснікі, як правіла, пісьменныя людзі. А таму існуе значная частка аўтараў і публікацый, асабліва ў інтэрнэт-прасторы, якія свядома (а хтосьці і не наўмысна) навукападобна заблытваюць праблему свецкасці выхаваўча-адукацыйнага працэсу.

Іх матывацыя зразумелая. Касцёльныя (царкоўныя) структуры прагнуць злучыць сваю дзейнасць са школьнай справай, імкнуцца пашырыць свой удзел у школьным адукацыйным працэсе, зрабіць абавязковым выкладанне царкоўных прадметаў, дамагчыся дзяржаўнага фінансавання і маральна-палітычнага панавання царквы над грамадствам, падобна перыяду сярэдневяковай гісторыі.

Для гэтага выкарыстоўваецца аб’ектыўна існуючая блізкасць задач, форм і метадаў ажыццяўлення выхаваўча-адукацыйнага працэсу і канфесійна-дактрынальнай дзейнасці царкоўных структур. Грамадству навязваецца думка пра аднатыпнасць дзейнасці, форм працы і задач, мэт школы і царквы. Гэтыя дзве структуры падаюцца, як аднолькавыя («тоесныя»), маўляў, «несправядліва» аддзеленыя адна ад другой. Такія меркаванні засноўваюцца на Свяшчэнным Пісанні: «...идите и научите ... народы...» (Евангелле ад Матфея [3]). Усё гэта вядзе да пераканання, што «вучыць» – гэта адзіны магчымы працэс. Не важна «чаму вучыць?», «як вучыць?» і «у імя чаго вучыць?» – галоўнае вучыць.

Іншымі словамі, усё вынікаючае з кантэксту падобных публікацый сведчыць пра тое, што і «школа», і «царква» выконваюць у грамадстве практычна адну і тую ж функцыю. Выснова з гэтых размоў напрошваецца сама сабой: «чаму ж не аб’яднаць іх намаганні», чаму не зрабіць «Закон Божы» абавязковым прадметам у школах, каледжах, ліцэях і ВНУ ? Ад гэтага, маўляў, выйграюць усе, асабліва грамадства, якое стане яшчэ больш «выхаванае», «маральнае», богападобнае і г. д.

Паспрабуем спыніцца на сутнасным адрозненні «выхаваўча-адукацыйнай» (альбо «адукацыйна-выхаваўчай») *свецкай* дзейнасці школы ад канфесійна-выхаваўчай дзейнасці царкоўных структур, на «гісторыі» вызначанай праблемы, з якой таксама нельга не рабіць высновы ў імя будучыні.

Адзначым спачатку, што вывучэнне гістарычнага мінулага чалавецтва пераканаўча сведчыць: свабода выхаваўча-адукацыйнага працэсу ад уплыву канфесій на працягу існавання таго ці іншага рэгіёна, народа (этнасу), краіны (дзяржавы) адыгрывала выключна важную ролю. Яна была індыкатарам сапраўднай свабоды грамадства, паказчыкам яго магчымасці рухацца да прагрэсу, быць незалежным ад клерыкалізму, які заўсёды быў для яго стрымліваючым фактарам [4]. Наяўнасць свецкасці школы ў значнай ступені характарызуе саму сутнасць існавання таго ці іншага грамадства ў гісторыі, тую сітуацыю, у якой развіваецца названы рэгіён, этнас альбо дзяржава.

Перш за ўсё маецца на ўвазе наяўнасць умоў для выразнага размежавання выхаваўча-адукацыйнага працэсу, з аднаго боку, і функцыянавання царкоўнай структуры – з другога. Наяўнасць свецкасці забяспечвае магчымасць рэалізацыі менавіта адукацыйна-выхаваўчых задач, якія маюць у дадзеным выпадку атрыбутыўны (неад’емны) характар паспяховасці грамадства, уласцівых менавіта адукацыйна-выхаваўчаму працэсу.

Любая рэлігія прэтэндуе на выхаванне грамадзян у адпаведнасці са сваёй дагматыкай. Выхаваўча-адукацыйны працэс як асобная сфера жыцця грамадства з’яўляецца даволі блізкай дзейнасцю (па формах рэалізацыі задач, якія стаяць на парадку дня) з той, якой займаецца царкоўная структура любой канфесіі.

Адрозненне заключаецца толькі ў тым, што царква прэтэндуе на ўкараненне ў свядомасць чалавека рэлігійна-дагматычных ведаў з мэтай карэкцыі яго светапогляду і павелічэння тым самым шэрагаў сваіх прыхільнікаў, «вернікаў», якія складаюць базу папаўнення даходаў канфесіі і ўзмацнення яе пазіцый у дадзеным канкрэтным грамадстве і ў свеце, калі гэта сусветная рэлігія. Тэрмін «вернікі» вельмі трапна адлюстроўвае рэчаіснасць – яны, менавіта вернікі, больш

дакладнае слова знайсці немагчыма, паколькі ў аснове царкоўнага веравучэння ляжыць тэзіс: «*веру – не веру*», а ў аснове навуковых ведаў – эксперыментальна-доказны падыход.

Для навуковага падыходу «*навукова тое, што супадае з аб'ектыўнай рэчаіснасцю і пацвярджаецца эксперыментальна*». Сутнасць выхаваўча-адукацыйнага працэсу заключаецца ў перадачы маладым людзям назапашанага былымі пакаленнямі грамадзян грамадска-значнага (найперш навуковага) вопыту, прычым менавіта ў перыяд іх фізічнага сталення і маральна-псіхалагічнага станаўлення. А перадаваемы вопыт, як вядома, мае як рацыянальны (найперш навуковы) складнік, які на працягу стагоддзяў і тысячагоддзяў з'яўляўся асноўным з фактараў, што забяспечвалі выжыванне чалавецтва і пастулпальнае развіццё грамадства ў гістарычнай перспектыве, так і выхаваўчыя каштоўнасці. Апошнія, як вядома, таксама з'яўляюцца рацыянальна-выверанымі мінулымі пакаленнямі, менавіта тымі, якія неабходны чалавеку на стадыях яго сталення ў мэтах станаўлення паўнапраўнага чалавека і грамадзяніна. Яны ўключаюць у сябе цэлы комплекс маральна-этычных, культурных, псіхолага-паводзінскіх, светапоглядных і навуковых каштоўнасцей, неабходных асобнаму чалавеку для жыцця, а таксама як сацыяльна-адказнаму грамадзяніну для паспяховага развіцця формаў існавання грамадства і прасоўвання яго на новыя перспектыўныя рубяжы гістарычнай эвалюцыі.

Выхаваўчы эфект ад дзейнасці царквы таксама, безумоўна, маецца. Рэлігійна-царкоўная дагматыка, вядома, грунтуецца на агульначалавечых каштоўнасцях (у тым ліку і рацыянальна-выверанах, тых, якія распрацоўваліся грамадствам на працягу гісторыі развіцця выхаваўча-адукацыйнага працэсу). Тым самым, яна часткова station ўплывае і на развіццё выхаваўча-адукацыйнага працэсу. Але, тым не менш, трэба мець на ўвазе, што блізкасць формаў і метадаў дзейнасці канфесійных структур з адукацыйна-выхаваўчымі ўстановамі ні ў якім разе не робіць іх тоеснымі.

Адрозненне заключаецца ў тым, што царква распаўсюджвае рэлігійную дагматыку, а ў працэсе адукацыйна-выхаваўчай дзейнасці рэалізуюцца выключна грамадска-значныя задачы па перадачы рацыянальных ведаў і сацыяльнага досведу, неабходнага для грамадскага прагрэсу.

Інакш кажучы, грамадству XXI стагоддзя, каб рухацца наперад, патрэбна свецкая школа. «Свецкая школа, – як адзначыў адзін з вядомых педагогаў сучаснай Расіі Яўген Ямбург, – гэта тэхніка бяспекі» [5], тэхніка бяспекі грамадства ад клерыкалізму, засілля ў навуцы і адукацыі, спусташэння рацыянальнага і ператварэння яго ў дагматычна-схаластычнае.

Але ці павінна сучасная школа быць атэістычнай? Думаецца, наўрад ці. Духоўныя якасці (іх непахіснасць для выхаванага чалавека) гэта тое, чаго не стае ў сучасным грамадстве. І тут, безумоўна, хрысціянскія каштоўнасці (для вернікаў іншых рэлігій – іншыя) могуць быць той базай, на якой ідзе выхаванне чалавека XXI стагоддзя. Самае важнае тут – не блытаць «духоўнасць» і «клерыкалізм», не ператвараць царкву ў маральнага цэнзара грамадства і не надаваць ёй абавязковыя функцыі ў дзяржаве (школе, ССНУ, ВНУ). Свабода сумлення, свабода выбару для чалавека, «у што верыць», «як верыць» і «ці верыць увогуле» – гэта аснова грамадзянскай свабоды.

Каб яшчэ больш выразна паказаць гісторыю «праблемы свецкасці», высветліць тыя памылкі, якія можа зрабіць грамадства XXI стагоддзя (у любой з еўрапейскіх краін), якое злучыць «школу» і «царкву», звернемся да гісторыі. Спынімся на праблеме свецкасці выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў Еўропе на мяжы XVIII–XIX стст. (на прыкладзе Беларусі і Францыі).

Актуальнасць дасягнення свецкага характару выхаваўча-адукацыйнага парацэсу ў названы перыяд і вастрыня гэтай праблематыкі вызначаліся задачамі развіцця грамадства, што фарміраваліся яшчэ ў больш раннія стагоддзі. Завяршэнне перыяду сярэдневякоўя, крызіс і падзенне феадальна-прыгонніцкага ладу пад ударам пашырэння таварна-грашовых адносін «спарадзілі» эпоху Адраджэння, падчас якой так званае «трэцяе саслоўе» (будучы клас буржуазіі) умацавалася, стварыла сваю гуманістычную ідэалогію як антыпод царкоўна-схаластычнаму разуменню рэчаіснасці, прапагандуемую царкоўна-дактрынальнымі структурамі.

На змену перыяду эпохі Адраджэння ў беларускай культуры, як і ў еўрапейскіх краінах (і Францыі ў тым ліку), прыйшоў перыяд контррэфармацыі. Пасля Люблінскай уніі 1569 года віленскі біскуп Валерыян Пратасевіч запрасіў у ВКЛ 13 прадстаўнікоў ордэна езуітаў. Праз год іх ужо было каля 300 чалавек (місіянеры, багасловы, прапаведнікі). Яны разгарнулі буйнамаштабную

дзейнасць па аднаўленні страчаных за перыяд рэфармацыі пазіцый каталіцкага касцёла, а разам з тым і пашырэнні паланізацыі на тэрыторыі Беларусі. Пачаўся перыяд контррэфармацыі, які ізноў аднавіў пазіцыі царкоўнай прысутнасці ў выхаваўча-адукацыйным працэсе.

Праблема свецкасці адукацыі ў названы перыяд была даволі актуальнай для розных краін Еўропы. XVIII стагоддзе – гэта заключны этап дзейнасці ордэна езуітаў у Еўропе. Да гэтых часоў ордэн заявіў пра сябе як пра арганізацыю, што разгарнула найбольш актыўную дзейнасць у сферы выхаваўча-адукацыйнага працэсу. Нездарма педагагічная дзейнасць ордэна езуітаў – адзін з двух фундаментальных прынцыпаў («місіянерская дзейнасць і выхаванне юнацтва ў каталіцкай традыцыі»), распрацаваных яшчэ стваральнікам ордэна іспанскім дваранінам І. Лаёлам [6].

«У 1540 годзе ордэн налічваў толькі 10 рэгулярных членаў і не меў уласнай рэзідэнцыі. У 1556 годзе (на тэрыторыі розных дзяржаў. – *В. П.*) у яго было ўжо 12 правінцый, 79 дамоў і каля 1000 членаў. Праз 18 гадоў у 1574 г. існавала ўжо 17 правінцый, 125 калегій, 11 навіцыятаў, 35 пасяленняў і 4000 членаў. Праз пакаленне, у 1608 годзе, – 31 правінцыя, 306 калегій, 40 навіцыятаў, 21 дом прафесаў, 65 рэзідэнцый і місій, 10640 членаў...» [7]. А да 50–70-х гг. XVIII ст., калі езуітаў пачалі масава выганяць з розных краін Еўропы (з Партугаліі (1759), Францыі (1764), Іспаніі і Неапаля (1767)) і да часу фактычнай ліквідацыі ордэна ў 1773 годзе папам Клімента XIV, гэта быў перыяд найбольшага распаўсюджання езуіцкіх адукацыйных устаноў у розных краінах свету (у Беларусі і Францыі ў тым ліку). У гэты перыяд пад уплывам езуітаў знаходзілася абсалютная большасць сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў Заходняй Еўропы.

Францыя як адна з вядучых каталіцкіх краін мела велізарную колькасць езуіцкіх устаноў. Прафесар Бонскага, Марбургскага і Лейпцыгскага ўніверсітэтаў Генрых Бёмер (1869–1927) у сваёй кнізе «Гісторыя ордэна езуітаў» адзначаў: «…Ужо ў 1610 годзе ён (ордэн. – *В. П.*) налічваў у сваіх чатырох французскіх правінцыях 36 калегій, пяць навіцыятаў, адзін дом прафесаў, адну місію і каля 1400 членаў…» [8].

У распараджэнні езуітаў былі розныя віды ўстаноў: ***навіцыяты*** (установы, прызначаныя для «навіцыяў», што праходзілі 2-гадовы выпрабавальны тэрмін пры ўступленні ў члены ордэна); ***езуіцкія калегіі*** і ***акадэміі*** (выхаваўча-навучальныя ўстановы школьна-ўніверсітэцкага тыпу); ***дамы прафесаў*** («прафесы» – сапраўдныя члены ордэна, якія прайшлі ўсе выпрабаванні і мелі права ўдзельнічаць у кіраўніцтве ордэнам); *місіі* і *рэзідэнцыі* (установы, прызначаныя для выканання задач па распаўсюджванні ўплыву ордэна езуітаў у асобным рэгіёне) і інш.

«У 1640 годзе ордэн меў (у Францыі. – *В. П.*) 65 калегій, 2 акадэміі, 2 семінарыі, 9 пансіёнаў, 7 навіцыятаў, 4 дамы прафесаў, 16 рэзідэнцый, дзе было 2050 членаў...». Пазней «... у 1679 годзе: 83 калегіі, 5 семінарый і пансіёнаў, 8 навіцыятаў, 5 дамоў прафесаў, 21 рэзідэнцыю і місію, дзе было больш за 2500 членаў». І нарэшце «... у 1750 годзе: 84 калегіі, 64 іншыя дамы з больш чым 4000 членамі...» [8].

Навукова-рацыянальны кантэкст дзейнасці школы, набыты за перыяд Адраджэння і Рэфармацыі ў краінах Еўропы, падчас контррэфармацыі быў практычна знішчаны і стаў панаваць сярэдневякова-схаластычны тып адукацыі. Грамадска-значная сфера выхавання і адукацыі ізноў, як і раней, апынулася ў руках царквы.

Схаластыка, як вядома, рэлігійная філасофія, якая характарызуецца спалучэннем багаслоўска-дагматычных мэт і задач з рацыяналістычнай методыкай іх дасягнення і вырашэння. Асновай яе інструментарыю з’яўляецца фармальна-лагічная праблематыка, якая рэалізуецца праз рацыяналістычныя метады. Іншымі словамі, яна грунтуецца на фармальных ведах, якія зусім адарваны ад жыцця і прыродазнаўчай практыкі.

Навучанне ў сярэдневяковай схаластычнай школе адбывалася з дапамогай дыспутаў. Дыспут – «навуковая спрэчка», якая праводзіцца для высвятлення «тэалагічнай альбо навуковай ісціны» шляхам спасылак на аўтарытэтныя пісьмовыя крыніцы (працы вядомых тэолагаў і інш.) і пільны аналіз аргументаў кожнага з бакоў, удзельнікаў дыспуту. Прадметам «навуковага» дыспуту (тэмай дыспуту) магло быць, напрыклад, пытанне: «*Колькі анёлаў магло б сесці (змясціцца) на вострым канец іголкі*» [9, с. 137–143]. Іншымі словамі, для схаластыкі было важна навучыць «навукападобна» спрачацца, умець прывесці аргументы ў пацвярджэнне нават зусім фантомнай, выдуманай (неіснуючай у жыцці) «ісціны». Гэта было выдатным спосабам падрыхтоўкі дагматыкаў, царкоўных

ідэолагаў (абаронцаў) пастулатаў, якія заснаваны на тэзісе «веру – не веру», не мелі ніякіх адносін да навукі і ніяк не падмацоўваліся жыццёвай практыкай.

Але гісторыя рухалася наперад. У другой палове XVIII ст. з'явілася ідэалогія Асветніцтва. На тэрыторыю Беларусі ідэі Асветніцтва прыйшлі з Еўропы. Гэты ідэйны рух з'яўляўся працягам гуманістычных традыцый Адраджэння, ён зарадзіўся ў Англіі ў канцы XVII ст., але сваю назву і найвышэйшае развіццё Асветніцтва атрымала ў Францыі ў XVIII ст.

Характэрнай рысай Асветніцтва было ўспрыманне (разуменне) асветы і навукі як магутнага рычага сацыяльнага прагрэсу. Замацаванню ідэалаў Асветніцтва ў грамадскай свядомасці спрыялі навуковыя адкрыцці ў прыродазнаўстве і дасягненні ў галіне гуманітарных ведаў. Гэтыя «адкрыцці» і «дасягненні» аказалі выключна моцнае ўражанне на найбольш адукаваных прадстаўнікоў грамадства. Большасць з іх пачала лічыць, што чалавецтва (у гісторыі) развіваецца ў першую чаргу таму, што развіваецца адукацыя, асвета і пашыраюцца навуковыя веды ў грамадстве.

З'яўленне ідэалогіі Асветніцтва было звязана з развіццём капіталізму. Гэта была новая спроба класа буржуазіі (пасля ідэалогіі Адраджэння, якая была прыніжана і амаль знішчана контррэфармацыяй) замацаваць свае светапоглядныя ідэалы і разуменне перспектыў эвалюцыі грамадскага прагрэсу ў якасці агульнапрынятых. Буржуазныя рэвалюцыі ў Нідэрландах (1566–1609) і Англіі (1642–1660) аслабілі пазіцыі контррэфармацыі ў Еўропе.

Але найбольшага выяўлення ідэалы Асветніцтва атрымалі ў Францыі, якая няўхільна рухалася ў бок Вялікай французскай рэвалюцыі (1789–1799). Там наступленне крызісу феадалізму было найбольш выразным. Французская буржуазія назапасіла буйныя капіталы, стала ўплывовай эканамічнай сілай. Яна патрабавала падпарадкавання эканомікі сваім інтарэсам і ўдзелу ў рэальным кіраванні краінай. Гэтаму замінала абсалютысцкая форма манархіі, што кіравала краінай. Кансерватыўна-каталіцкія сілы, духавенства і дваранства, якія ўмацавалі сваё становішча падчас контррэфармацыі, аб'ядналіся вакол каралеўскага двара і імкнуліся захаваць свой сярэдневякова-схаластычны погляд на развіццё грамадства ў якасці пануючага ў краіне. Ідэолагамі буржуазіі выступілі найбольш прагрэсіўныя на той час мысліцелі – Л. Мантэск'ё, Ф. Вальтэр, Ж.-Ж. Русо і інш., якія адстойвалі ідэал прыярытэту асветы і навукі ў развіцці грамадства і яго культуры.

Беларускае грамадства перажывала ў той перыяд не самыя лепшыя ў сваёй гісторыі гады. XVIII стагоддзе – гэта час палітычнага крызісу і смяротнай агоніі польска-беларуска-літоўскай дзяржавы – Рэчы Паспалітай. У канцы XVIII ст. адбыліся тры вядомыя падзелы Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795), падчас якіх тэрыторыя гэтай краіны была назаўсёды разарвана моцнымі суседзямі (Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй), у выніку чаго беларускія землі апынуліся ў складзе царскай Расіі.

Яшчэ да падзелаў Рэчы Паспалітай у развіцці адукацыі Беларусі адбыліся важныя змены, накіраваныя на пашырэнне свецкасці. Глыбокае аднаўленне школьна-адукацыйных устаноў у Рэчы Паспалітай (а значыць, на тэрыторыі ВКЛ і Беларусі) адбылося, пачынаючы з другой паловы XVIII ст. Гэта было звязана перш за ўсё са зменамі ў эканамічным жыцці грамадства, з развіццём навукі і сацыяльна-палітычнай і рэлігійнай сістуацыяй у Еўропе. Пачалося ўсё з таго, што на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, па-першае, распаўсюдзілася еўрапейская ідэалогія Асветніцтва, а па-другое, у 1773 годзе Папа рымскі забараніў дзейнасць ордэна езуітаў.

Гэтыя дзве перадумовы выклікалі карэнныя змены ў сістэме адукацыі краіны, якія захаваліся на тэрыторыі Беларусі да пачатку XIX ст. У выніку ліквідацыі ордэна езуітаў, які трымаў фактычна абсалютную большасць школьна-адукацыйных устаноў на тэрыторыі краіны, быў створаны спецыяльны орган па кіраванні выхаваўча-адукацыйным працэсам, што атрымаў назву «Адукацыйная камісія» (польск.: *Komisija Edukacji Narodovej*; рус.: «*Эдукационная комиссия*»; бел.: «*Камісія Народнай Адукацыі*»; «*Камісія па нацыянальнай адукацыі*» альбо «*Адукацыйная камісія*»).

Менавіта ў гэты час былі зроблены рашучыя крокі па ўсталяванні свецкай школы. Але, разам з тым, варта заўважыць, што гэтая праца тут была распачата не менш чым на дзесяцігоддзе раней. «У Рэчы Паспалітай яшчэ да скасавання закону езуітаў абмяркоўваліся планы… (у гэтым кірунку. – *В. П.*). Адукаваныя магнаты (А. Чартарыйскі, А. Замойскі і інш.) яшчэ ў часы Аўгуста III пачалі распрацоўваць асноўныя прынцыпы новай сістэмы выхавання і адукацыі. На канвакацыйным сойме ў 1764 г. А. Замойскі абвясціў агульны план яе пераўладкавання – секулярызацыю,

стварэнне Міністэрства асветы, наданне адукацыі нацыянальнага характару, сувязь выхавання з патрабаваннямі эканамічнага і палітычнага жыцця краіны» [10, с. 18].

«Камісія…» была заснавана ў 1773 г. соймам Рэчы Паспалітай (1773–1775 гг.). Мэтай арганізацыі такой структуры было правядзенне рэформаў у галіне выхаваўча-адукацыйнага працэсу краіны. Прычынай стварэння свецкай арганізацыі з функцыямі Міністэрства адукацыі была забарона рымскім папскім прастолам дзейнасці ордэна езуітаў у 1773. Дарэчы, у Расіі і на тэрыторыі Беларусі пасля яе далучэння да Расіі ён існаваў яшчэ да 1820 г., служыў, па меркаванні царска-расійскіх ідэолагаў, мэтам «заспакаення краю» пасля гвалтоўнай акцыі «далучэння».

Згодна з ўмовамі забароны ордэна ў Рэчы Паспалітай уся нерухомая маёмасць перадавалася ў вечную арэнду шляхце з абавязкам выплочваць 4,5% яе ацэначнага кошту ў год на карысць адукацыі. Для размеркавання атрыманых сродкаў і найлепшага іх укладання ў развіццё адукацыі і асветы быў створаны орган, які атрымаў назву Адукацыйная камісія. Першым кіраўніком «Камісіі...» быў віленскі біскуп І. Я. Масальскі (1773–1778 гг.). У яе склад у розныя часы ўваходзілі І. Патоцкі, Я. Снядэцкі, І. Храптовіч, А. Паплаўскі, Г. І. Чартарыйскі, А. Замойскі, С. Панятоўскі, Г. Страйноўскі і інш.

Гэта былі высокаадукаваныя і патрыятычна накіраваныя дзеячы Польшчы, Беларусі і Літвы, якія імкнуліся вывесці Рэч Паспалітую з эканамічнага і палітычнага крызісу. У выніку рэформы школы і ўніверсітэты краіны былі пераведзены на прынцыпы ідэй Асветніцтва (свецкасць, навукова-рацыяналістычны змест адукацыі і інш.). Адзначаюцца тры этапы рэфармавання, праведзеныя ў 1773–1792 гг. На першым этапе ішла распрацоўка новай арганізацыйнай структуры сістэмы адукацыі і замена настаўнікаў (адхіленне езуітаў). На другім быў распрацаваны і апублікаваны «*Статут, прадпісаны Камісіяй народнай асветы для акадэмій і школ Рэчы Паспалітай*» які гарантаваў самакіраванне ў галіне кадравай палітыкі, фіксаваную заработную плату настаўнікаў і іх пенсійнае забеспячэнне, а таксама ступеньчатую (іерархічную) сістэму ўстаноў школьнай адукацыі.

Сістэма адукацыі ў выніку была трохступеньчатая: <u>Першая ступень</u> – *універсітэт* (не толькі ў якасці вышэйшай навучальнай установы, але ў якасці адміністрацыйнай установы па кіраванні школамі адпаведнай «навучальнай акругі»). На тэрыторыі Польшчы (у Кароне) такую функцыю ажыццяўляў Ягелонскі ўніверсітэт (у г. Кракаве), а на тэрыторыі Княства – Галоўная школа ВКЛ (утворана на базе Віленскай езуіцкай акадэміі), пазней з 1803 па 1832 г. – Віленскі ўніверсітэт.

<u>Сярэднюю ступень</u> складалі таксама ўзаемападпарадкаваныя паміж сабой «*акруговыя*» (на тэрыторыі Беларусі: у Брэсце, Гродне і Навагрудку) і «*падакруговыя*» школы. Паспяховае заканчэнне сярэдняй школы давала права навучэнцам паступаць ва ўніверсітэт і атрымліваць вышэйшую адукацыю. <u>Трэцяй</u>, ніжэйшай <u>ступенню</u> адукацыі павінны былі стаць *парафіяльныя вучылішчы*, адкрыццё якіх прадугледжвалася ў гарадах і мястэчках краіны. Кіраванне імі ажыццяўляў рэктар «акруговай» школы альбо прэфект «падакруговай» школы.

Найбольш значным дасягненнем рэформы было ажыццяўленне рэальнай спробы вызваліць сістэму адукацыі ад прамога ўплыву каталіцкай царквы і надаць працэсу навучання свецкі (навукова-рацыянальны) характар. Менавіта такія патрабаванні эпохі Асветніцтва былі ў той час найбольш прагрэсіўнымі і запатрабаванымі ў Еўропе. Яны азначалі пераход краін заходнееўрапейскай цывілізацыі да новага, прагрэсіўнага (у параўнанні з феадалізмам) сацыяльна-эканамічнага буржуазнага ладу.

Галоўная ўвага ў навучальным працэсе надавалася прадметам фізіка-матэматычнага цыкла. Асаблівае пашырэнне атрымала фізіка. У праграму гэтага прадмета былі ўключаны элементы земляробства, батанікі, садоўніцтва, мінералогіі і гігіены. Для складання вучэбных праграм рэфармуемай школы і падрыхтоўкі новых падручнікаў «Камісія...» зацвердзіла спецыяльны орган «Таварыства элементарных кніг», які ў сваёй рабоце арыентаваўся на заходнееўрапейскія, найперш французскія, распрацоўкі. Адным з найбольш актыўных членаў гэтага «Таварыства...» быў вядомы вучоны, выхадзец з беларускай лідчыны Казімір Нарбут.

Практычная накіраванасць навучання выявілася ў тым, што ў пералік праграмных прадметаў уводзіліся: асновы геаметрыі, ветэрынарыі, камерцыі і іншых запатрабаваных у той час дысцыплін. Вывучэнне гісторыі імкнуліся адмежаваць ад палітыка-ідэалагічных ведаў. На належным

узроўні наладжвалася сістэма фізічнага выхавання вучняў. Абавязковым станавілася вывучэнне замежных моў. З вучэбных праграм выключаліся тэалагічныя дысцыпліны, а Закон Божы пераставаў быць школьным прадметам і адыходзіў да сферы касцёльна-царкоўнай дзейнасці.

На жаль, не ўсё задуманае і заяўленае ў «Статуце...» членамі «Камісіі…» ўдалося ажыццявіць на практыцы. Супраць новых падыходаў да сістэмы выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў краіне рэзка выступілі кансерватыўныя колы. Памешчыкі і духавенства практычна сарвалі арганізацыю ніжэйшай ступені адукацыі («*парафіяльных*» школ), якая была разлічана на дзяцей з сялянска-рамесніцкага асяроддзя гарадоў і мястэчак. Не падабалася гэта і суседнім дзяржавам – Аўстрыі, Прусіі і Расіі. Яны ў той час якраз стымулявалі працэс паглыблення крызісу ў Рэчы Паспалітай для таго, каб хутчэй разарваць на часткі («падзяліць») яе тэрыторыю. У выніку, «Статут...» Адукацыйнай камісіі быў адменены прарасійскай Таргавіцкай канфедэрацыяй у 1794 г., а сама яна была распушчана.

Нягледзячы на гэта, сістэма адукацыі, распрацаваная і ажыццёўленая падчас рэформы, працягнула сваё існаванне на беларускіх землях і пасля іх далучэння да Расійскай імперыі. Спыненне навацый, ажыццёўленых Адукацыйнай камісіяй на тэрыторыі Беларусі, адбылося толькі ў выніку рэформы школ, праведзенай расійскім царызмам у XIX стагоддзі.

Самым галоўным дасягненнем Адукацыйнай камісіі было зацвярджэнне свецкага характару навучання і адукацыі. Агульнае кіраўніцтва справай асветы забіралася з ліку духавенства і перадавалася дзяржаўным органам. Калі раней дзяцей у школах навучалі перш-наперш рэлігійнасці, то цяпер галоўнае месца пачалі займаць прадметы прыродазнаўчага цыкла і навукова-рацыяналістычнага зместу.

Больш чым за 20 гадоў сваёй дзейнасці Адукацыйная камісія заснавала шэраг новых школ. Асаблівую цікавасць выклікаюць закладзеныя ў Гародні і Паставах мецэнатам Антоніем Тызенгаўзам шматлікія прафесіянальныя ўстановы. У 70-я гг. XVIII ст. ён арганізаваў (першыя ў Рэчы Паспалітай): медыцынскую, ветэрынарную, акушэрскую школы; майстэрні для навучання чарчэнню і маляванню; а таксама ўстанову для набыцця прафесійнай адукацыі фінансавых кантралёраў; мастацка-тэатральную школу. Асабліва адметна, што ў іх вучыліся пераважна дзеці беларускіх прыгонных сялян.

Свецкасць школы ў Францыі таксама пачалася пасля забароны ордэна езуітаў. «Выгнанне езуітаў з Францыі … паставіла тут пытанне аб арганізацыі свецкай школы. Але … (гэтая тэндэнцыя. – *В. П.*) ахапіла не толькі Францыю. Неабходнасць рэфармавання, і найперш секулярызацыі сістэмы адукацыі, была надзённым пытаннем для многіх еўрапейскіх краін [10, с. 18]. Яна стымулявалася пераходам дзяржаў Еўропы да новай, прагрэсіўнай на той час, «*капіталістычнай*» сацыяльна-эканамічнай фармацыі.

Адрозненне Беларусі і Францыі было толькі ў тым, што тэрыторыя Рэчы Паспалітай (ВКЛ і Беларусі ў тым ліку) пазбавілася ад езуітаў пасля афіцыйнага падпісання папам Кліментам XIV (21.07.1773 г.) свайго знакамітага «Паслання» [11], а Францыя выгнала езуітаў сама.

Адбылося гэта 6 жніўня 1762 г., калі парыжскі парламент прыняў указ аб роспуску ордэна езуітаў. У чэрвені 1763 года французскі кароль Людовік XV з роду Бурбонаў, якія кіравалі ў многіх краінах Еўропы, аб’явіў аб канфіскацыі маёмасці ордэна на карысць Кароны. Папа Клімент XIII паспрабаваў супрацьстаяць гэтаму (выдаў канстытуцыю, дзе пацвердзіў прывілеі ордэна). Але тэкст гэтага дакумента быў афіцыйна спалены ў Францыі «рукой палача» і адхілены іншымі еўрапейскімі краінамі.

Пазней пачаўся «парад арыштаў» і высылкі ў Рым ненавісных езуітаў. У Іспаніі ордэн быў таксама забаронены і ў турму было кінута каля 6000 самых вядомых езуітаў. Кароль Карл III пасадзіў арыштаваных на караблі і адправіў «…у падарунак папе…». Тое ж самае зрабіла кіраўніцтва Партугаліі і некаторых іншых каталіцкіх краін. У Рыме зразумелі, што настаў час забараніць ордэн. У адваротным выпадку можна было ўвогуле пазбавіцца ад уплыву каталіцкага касцёла ў Еўропе. Наступны папа, Клімент XIV, ажыццявіў канчатковую забарону ордэна ў 1773 годзе, і з гэтага часу езуітаў выгналі з астатніх еўрапейскіх краін.

У той жа самы час у еўрапейскім грамадстве XVIII ст. ішла распрацоўка навукова-ідэалагічнай канцэпцыі свабоды ад клерыкалізму і ўмацавання нацыянальнага кантэксту выхаваўча-аду-

кацыйнага працэсу. Гэта адбывалася як на тэрыторыі Францыі, так і ў Беларусі. Так, вядомы французскі гісторык і педагог, прафесар рыторыкі і красамоўства, былы рэктар Парыжскага ўніверсітэта Ш. Рален (1661–1741) у сваім «Трактаце аб адукацыі» (*фр.*: «*Le Traité des études*»), напісаным у другой палове 20-х гг. XVIII ст., выступіў за тое, каб школьныя прадметы вывучаліся не на латыні, як раней, а на роднай (французскай) мове, а таксама за скарачэнне вывучэння гісторыі старажытнасці і пашырэнне вывучэння айчыннай гісторыі» [12].

Трактат аб адукацыі Ш. Ралена быў прыкметнай з'явай у гісторыі Францыі. Аб ім з захапленнем гаварыў найвялікшы французскі філасоф эпохі Асветніцтва Ф.-М. Вальтэр (1694–1778), ён захапляўся «высакароднасцю і лёгкасцю» мовы напісанага твора. Па меркаванні вядомага французскага педагога Ж.-Ж. Русо (1712–1778), якога сучасныя навукоўцы лічаць адным з ідэолагаў Вялікай французскай рэвалюцыі, педагагічныя ідэі Ш. Ралена аказалі значны ўплыў на выхаваўча-адукацыйны працэс у Францыі XVIII ст. Твор Ш. Ралена, такім чынам, быў адной з зыходных кропак руху да прагрэсу французскай школы, ад якой адштурхоўваліся ідэолагі Рэвалюцыі.

Вядомы філосаф эпохі Асветніцтва, ураджэнец Беларусі (Лідскі павет), Казімір Нарбут (1738–1807), прафесар філасофіі (брат беларускага гісторыка Тэадора Нарбута) прысвяціў значную частку сваіх прац абгрунтаванню права на свабоду філасофіі (як навукі) ад рэлігійнага дагматызму. У сваіх працах ён прынцыпова выступаў за вызваленне філасофіі ад схаластыкі і багаслоўя. Быў шчырым прыхільнікам навуковага падыходу да арганізацыі жыцця грамадства. Асабліва крытычна ён ставіўся да езуіцкай сістэмы выхавання, што ажыццяўлялася ў калегіях і акадэміях. Яго ідэалам былі свецкая адукацыя і выхаванне. Прычым ён быў сярод тых, хто займаўся школьнай рэформай у ВКЛ. У 1775 годзе Адукацыйная камісія прызначыла Казіміра Нарбута членам «Таварыства пачатковых кніг». Гэта быў адзін з «...выканаўчых органаў …Камісіі, мэтай якога была падрыхтоўка і рэцэнзаванне школьных праграм, ацэнка дасланых на конкурснай аснове праектаў школьных кніг, іх друкаванне і дастаўка ў школы, якія дзейнічалі ўжо па новых правілах...» [13].

Прынцып свецкасці і свабоды сумлення ўпершыню быў абвешчаны ў Францыі ў артыкуле 10 «Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна» (1789 г.), дзе адзначалася: «Ніхто не павінен быць падвергнуты ўціску за свае погляды, нават рэлігійныя, пры ўмове, што іх абнародаванне не парушае грамадскі парадак, устаноўлены законам» (*фр.*: *Nul ne doit être inquiété pour ses opinions, même religieuses, pourvu que leur manifestation ne trouble pas l'ordre public établi par la Loi*) [14].

Паказальна, што Францыя і Рэч Паспалітая (часткай якой з'яўлялася ВКЛ і тэрыторыя Беларусі ў тым ліку) знаходзіліся ў XVIII ст. у авангардзе сусветнага сацыяльна-палітычнага прагрэсу. У 1791 г. у Рэчы Паспалітай была прынята першая ў Еўропе (2-я ў свеце пасля ЗША) Канстытуцыя. Цікава, што першая папраўка да Канстытуцыі ЗША (што служыла ўзорам для астатніх прагрэсіўных дзяржаў свету), прынятая 15.12.1791 г., абвяшчала пра аддзяленне царквы ад дзяржавы і разумелася заканадаўцамі як забарона на ўстанаўленне дзяржаўнай рэлігіі [15].

Падчас Вялікай французскай рэвалюцыі (1789–1799 гг.), якая абвясціла лозунг «Свабода, роўнасць, братэрства» ў 1793 г., была прынята Канстытуцыя Францыі. У яе аснове ляжаў тэкст «Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна» (1789 г.), што грунтаваўся на прынцыпе свабоды сумлення. Рэлігія падчас французскай рэвалюцыі была ўзята пад дзяржаўны кантроль. Змены ў адваротны бок адбыліся толькі падчас прыходу да ўлады Напалеона I Банапарта. Кіраўнік Францыі ў мэтах усталявання свайго палітычнага становішча і ўмацавання дзяржаўнай улады ў 1801 годзе заключыў дагавор («Канкардат», *фр.*: *Concordat de Napoléon*) з папам Піем VII (1800–1823) [16].

Яго тэкст адмяніў палажэнні, адхіляючыя папства ад прызначэння епіскапаў, замацаваныя Рэвалюцыяй. Так, дакумент 1790 г. «Грамадзянская канстытуцыя духавенства» (*фр.*: *Constitution civile du clergé*) фактычна ператвараў духавенства ў дзяржаўных чыноўнікаў [17]. Згодна з яго тэкстам, епіскапы выбіраліся тымі ж структурамі, што і дэпутаты, члены судоў першай інстанцыі і дэпартаментальная адміністрацыя. А кіраўнікі парафій таксама выбіраліся, а потым павінны былі атрымаць зацверджанне (інсталяцыю) епіскапа. Прычым Закон не патрабаваў, каб выбаршчыкамі былі менавіта католікі. Што тычыць новаабраных епіскапаў, то яны толькі паведамлялі папе аб сваім уступленні на пасаду.

Папскі прастол у сваю чаргу абавязваўся не прымаць рашэнняў, якія будуць супярэчыць палітыцы І Консула (пазней імператара) Францыі (Напалеона І Банапарта). Пасля падпісання Канкардата французскае дзяржаўнае кіраўніцтва дазволіла значнае пашырэнне ўплыву каталіцкай царквы ў грамадстве, у тым ліку і адступленне ў справе барацьбы за свецкасць у галіне выхаваўча-адукацыйнага працэсу. Дасягненні эпохі Рэвалюцыі, такім чынам, былі ў значнай ступені нівеліраваны.

Барацьба за новую (свецкую і навукова-рацыянальную) школу працягвалася і ў XIX ст. Прычым там былі не толькі поспехі ў гэтым кірунку, але і прыкрыя перыяды адступлення і адкатвання на прынцыпы амаль сярэдневякоўя, дзе пазіцыі клерыкалізму ўзмацняліся. Сітуацыя на тэрыторыі Беларусі змянілася ў канцы 1850-х гг. Кіраўніцтва царскай Расіі, ускраінай якой былі беларускія землі, пачало адкрываць тут пачатковыя школы для сялян.

Іх называлі «*Училища для поселянских детей*» альбо «царкоўна-прыходскія» школы. Яны дзейнічалі часткова за кошт сродкаў дзяржавы, альбо фінансаваліся праваслаўнай царквой ці сялянамі. Гэта былі элементарныя школы, дзе вучылі рускай мове, пачаткам арыфметыкі і праваслаўным малітвам. Самай важнай задачай гэтых школ была «русіфікацыя» беларускіх сялян і іх «катэхізацыя» (launch ператварэнне ў прыхільнікаў рускай праваслаўнай царквы, якая была галоўным ідэалагічным інструментам у руках улады).

Пэўным поспехам у справе барацьбы «за свецкасць» на тэрыторыі Беларусі з'яўляліся школьныя рэформы 60-х гг. XIX ст. Падчас іх правядзення былі ўзаконены тры тыпы агульнаадукацыйных навучальных устаноў («*народныя вучылішчы*», «*прагімназіі*» і «*гімназіі*») і намечана паступовае ажыўленне ў галіне выхаваўча-адукацыйнага працэсу. Але ўжо з пачатку 1870-х гг. у Расійскай імперыі (часткай якой была тэрыторыя Беларусі) ізноў пачалі дзейнічаць рэакцыйныя (па меркаванні навуковай грамадскасці) заканадаўчыя акты «Статут гімназій» (1871) і «Палажэнне аб рэальных вучылішчах» (1872). Апошняе змяніла парадак кіравання сістэмай народнай адукацыі з мэтай «охранения дела народного образования от посторонних пагубных влияний». У склад кіраўніцтва навучальнымі ўстановамі ўводзіліся найперш прадстаўнікі дваранства, а таксама быў устаноўлены «неослабный надзор со стороны духовенства» [18, т. 4, с. 400–404].

Згодна з гэтымі нарматыўнымі актамі, узнаўлялася саслоўная адасобленасць, якая разрывала адзіную сістэму адукацыі. У 1887 г. было выдадзена «Распараджэнне», якое ў асяроддзі прагрэсіўнай грамадскасці атрымала назву «Цыркуляр аб кухарчыных дзецях». У ім была сфармулявана забарона паступлення ў гімназіі і прагімназіі дзяцей падатковых саслоўяў (фурманаў, лакеяў, повараў, прачак, дробных гандляроў і інш.) «...детей, коим ... вовсе не следует стремиться к среднему и высшему образованию...» [19].

Але тым не менш барацьба за прагрэс грамадскай эвалюцыі, перашкодай якому быў царкоўнадактрынальны тып выхавання і адукацыі, а таксама панаванне царкоўнікаў у школьных структурах усё ж працягваліся далей. Канчатковае аддзяленне царквы ад дзяржавы як у Францыі, так і на тэрыторыі Расіі (і Беларусі ў тым ліку) адбылося ў пачатку XX стагоддзя. Законам «Аб аддзяленні цэркваў і дзяржавы» (09.12.1905 г. у Францыі [20]) і Дэкрэтам «Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы» (05.02.1918 г. у Савецкай Расіі [21]) быў замацаваны прынцып узаемаадносін дзяржавы і царквы ў абодвух краінах. Ён замацоўваў: «адмову ўмяшання дзяржавы ў царкоўныя справы»; «свабоду грамадзян ад прымушэння да спавядання той ці іншай рэлігіі»; «перапыненне замацаваных за царквой дзяржаўных функцый».

У выніку гэтых актаў адукацыйна-выхаваўчы працэс на тэрыторыі Беларусі і Францыі набыў свецкі статус. Ён дазволіў школьна-ўніверсітэцкім установам займацца сапраўднымі мэтамі адукацыі і выхавання як асобнай сферы жыцця грамадства ў гісторыі, перадаваць рацыянальна-выверанымя навукова-рацыяналістычныя веды, назапашаныя былымі пакаленнямі грамадзян, будучым. Інакш кажучы, выконваць сваю непасрэдную (асноўную) місію па дасягненні грамадска-значных мэт, наканаваных ім гісторыяй.

Такім чынам, праведзены намі кароткі агляд гісторыі эвалюцыі выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў дзвюх названых краінах, дзе працэс усталявання свецкай школы заняў даволі працяглы перыяд, сведчыць пра тое, што барацьба за секулярызацыю выхаваўча-адукацыйнай сфе-

ры жыцця грамадства стаяла на парадку дня прагрэсіўнай грамадскасці некалькі стагоддзяў. Яна была прадвызначана задачамі эвалюцыі грамадства, патрабаваннем прагрэсу і неабходнасці руху наперад. Працэс быў складаны. Дасягненні і прыкрыя перыяды адкату на пазіцыі клерыкалізму залежалі ад розных, найперш палітычных, фактараў. Але ўсё ж рух грамадства да прагрэсу суправаджаўся няўхільным імкненнем да аддзялення царквы ад дзяржавы і ад дзяржаўнай школы ў тым ліку.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Пілецкі, В. А. Выхаваўча-адукацыйны працэс у гісторыі Беларусі дахрысціянскага перыяду / В. А. Пілецкі. – 2-е выд., дапрац. – Мінск : Ковчег, 2017. – 372 с.

2. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 5. Кн. 1: С–У [рэд. тома М. Р. Суднік]. – Мінск: Бел.СЭ імя Петруся Броўкі, 1982. – 663 с.

3. Евангелие от Матфея, 28-я глава // Библия онлайн [Электронный ресурс]. – 2018. – Режим доступа: https://bible.by/syn/40/28/. – Дата доступа: 01.11.2018.

4. Клерикализм // Большой толковый словарь русского языка (БТС) С. И. Кузнецова / [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: https://gufo.me/dict/kuznetsov. – Дата доступа: 02.01.2019.

5. Ямбург, Е. Светская школа – это техника безопасности / Е. Ямбург // Интервью Дарьи Рыжковой с известным педагогом России [Электронный ресурс]. – 2018. – Режим доступа: https://jewish.ru/ru/interviews/articles/179815. – Дата доступа: 28.12.2018.

6. Православная энциклопедия / под ред. Патриарха Московского и всея Руси Кирилла [Электронный ресурс]. – 2018. – Режим доступа: http://www.pravenc.ru/text/293585.html. – Дата доступа: 12.03.2018.

7. Бёмер, Г. История ордена иезуитов / Г. Бёмер // Богатство иезуитов [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: http://www.e-reading.mobi/chapter.php/1033625/30/Bemer_-_Istoriya_ordena_iezuitov.html. – Дата доступа: 04.01.2019.

8. Бёмер, Г. История ордена иезуитов / Г. Бёмер // Иезуиты во Франции [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: http://www.e-reading.by/bookreader.php/1033625/Bemer_-_Istoriya_ordena_iezuitov.html. – Дата доступа: 04.01.2019.

9. Душенко, К. Ангелы на кончике иглы / К. Душенко // Культурология: Дайджест ; РАН. ИНИОН. Центр гуманит. науч.-информ. исслед. Отд. культурологии; редкол.: О. В.Кулешов [и др.]. – М., 2017. – (Сер.: Теория и истоия культуры /редсовет: Л. В. Скворцов [и др.]. – 2017. – №4 (83) – 251 с. [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: http://цгнии.инионран.рф/archives/777. – Дата доступа: 06.01.2019.

10. Куль-Сяльверстава, С. Я. Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: Фарміраванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII – 1820-я гады) / навук. рэд. П.І.Брыгадзін. – Мінск: БДУ, 2000. – 260 с.

11. Бреве // Католическая энциклопедия / Словари и энциклопедии на Академике [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: https://dic.academic.ru/dic.nsf/catholic/342. – Дата доступа: 07.01.2019.

12. Traité des études par Rollin, nouvell edition, revue par M.Letronne et accompagnee des remargues de Crevier. T.1. – Paris: Librairie, de H.Firmin didot, freres, fils et C*, 1863. – 534 p. [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: https://gallica.bnf.fr/ark:/12148/bpt6k204672h/f3.item. – Дата доступа: 16.01.2019.

13. Стасевіч-Ясюкова, І. Казімір Нарбут (1738–1807) / І. Стасевіч-Ясюкова / Камітэт гісторыі навукі і тэхнікі Польскай акдэміі навук; ГА "Таварыства польскай культуры на Лідчыне". – Варшава–Ліда, 2004 [Электронны рэсурс]. – 2019. – Рэжым доступу: http://pawet.net/library/history/city_district/data_people/scientists/narbutt_k/Казімір_Нарбут.html. – Дата доступу: 06.01.2019.

14. Déclaration des Droits de l'Homme et du Citoyen de 1789 [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: https://www.legifrance.gouv.fr/Droit-francais/Constitution/Declaration-des-Droits-de-l-Homme-et-du-Citoyen-de-1789. – Дата доступа: 23.01.2019.

15. Билль о правах Соединенных Штатов Америки (1791 год) [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: https://billofrightsinstitute.org/founding-documents/bill-of-rights/. – Дата доступа: 27.01.2019.

16. Le Concordat de 1801 [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: https://www.napoleon.org/histoire-des-2-empires/articles/le-concordat-de-1801/. – Дата доступа: 24.01.2019.

17. Constitution civile du clergé [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: http://www.nogentrev.fr/archives/2016/01/05/33164943.html. – Дата доступа: 29.01.2019.

18. Уставы школьные и университетские в России // Педагогическая энциклопедия: в 4 т. Т.4.: Сн – Я. – М.: Сов. энцикл., 1968. – 912 с.

19. Циркуляр о кухаркиных детях [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: http://doc.histrf.ru/19/tsirkulyar-o-kukharkinykh-detyakh/. – Дата доступа: 28.01.2019.

20. Loi du 9 décembre 1905 concernant la séparation des Eglises et de l'Etat [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: https://www.legifrance.gouv.fr/affichTexte.do?cidTexte=JORFTEXT000000508749. – Дата доступа: 30.01.2019.

21. Декрет Совета Народных Комиссаров «Об отделении церкви от государства и школы от церкви» [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: http://constitution.garant.ru/history/act1600-1918/5325/. – Дата доступа: 31.01.2019.

## References

1. Piletsky V. A. The upbringing-and-education process in the history of Belarus of the pre-Christian period, 2-e Izd., revised. Minsk, Kovcheg Publ., 2017. 372 p. (in Belarusian).

2. Explanatory dictionary of the Russian language. Vol. 5. kN.1 :S-U [Ed. tom M. G. Sudnik]. Minsk, Publishing house: Bel.SE name Petrus Brovkка, 1982, 663 p. (in Belarusian).

3. Gospel of Matthew 28 Chapter // Bible online 2018. Available at: https://bible.by/syn/40/28/ (Accessed 01.11.2018) (in Russian).

4. Clericalism. Great explanatory dictionary of the Russian language (BTS) S. I. Kuznetsov, 2019. Available at: https://gufo.me/dict/kuznetsov (Accessed 02.01.2019) (in Russian).

5. Yamburg E. Secular school is a safety technique. Daria Ryzhkova's Interview with the famous teacher of Russia. 2018. Available at: https://jewish.ru/ru/interviews/articles/179815 (Accessed 28.12.2018) (in Russian).

6. Orthodox encyclopedia (edited by Patriarch Kirill of Moscow and all Russia). 2018. Available at: http://www.pravenc.ru/text/293585.html (Accessed 12.03.2018) (in Russian).

7. Boehmer G. History of the order of Jesuits Wealth of Jesuits. 2019. Available at: http://www.e-reading.mobi/chapter.php/1033625/30/Bemer_-_Istoriya_ordena_iezuitov.html. (Accessed 04.01.2019) (in Russian).

8. Boehmer G. History of the order of Jesuits. Jesuits in France. 2019. Available at: http://www.e-reading.by/bookreader.php/1033625/Bemer_-_Istoriya_ordena_iezuitov.html (Accessed 04.01.2019) (in Russian).

9. Dushenko K. Angels on the tip of the needle. Culturology: Digest /RAS.INION. Center humanit.science.-inform. research. Otd. cultural studies; Rare. O. V. Kuleshov, ed. and others. Moscow, 2017. (Ser.: Theory and history of culture /Ed. advice: Skvortsov, LV pred. and others). 2017, no. 4 (83), 251 p. 2019. Available at: http://цгнии.инионран.рф/archives/777 (Accessed 06.01.2019) (in Russian).

10. Cul-Seliverstova S. E. Belarus on a boundary of centuries and cultures: the culture of New time in the Belarusian lands (second half of XVIII – 1820-ies). science. Ed. P. I. Brigadin. Minsk: BSU Publ., 2000. 260 p. (in Belarusian).

11. Logs. Catholic encyclopedia. Dictionaries and encyclopedias on the Academician. 2019. Available at: https://dic.academic.ru/dic.nsf/catholic/342 (Accessed 07.01.2019) (in Russian).

12. Treaty of the studies by Rollin, new edition, revised by M. Letronne, and accompanied by the remargues Crevier. T. 1. Paris: Librairie, H. Firmin didot, brothers, son, and C*, 1863, 534 p. 2019. Available at: https://gallica.bnf.fr/ark:/12148/bpt6k204672h/f3.item. (Accessed 16.01.2019) (in French).

13. Stasevich-Yasukawa I. Casimir Narbut (1738–1807). Committee of the history of science and technology of the Polish of Academy of Sciences; NGO "Society of Polish Culture in Lidoine". Warsaw–Lida, 2004. 2019. Available at: http://pawet.net/library/history/city_district/data_people/scientists/narbutt_k/Казімір_Нарбут.html (Accessed 06.01.2019) (in Belarusian).

14. Declaration of the rights of Man and The Citizen of 1789. 2019. Available at: https://www.legifrance.gouv.fr/Droit-francais/Constitution/Declaration-des-Droits-de-l-Homme-et-du-Citoyen-de-1789 (Accessed 23.01.2019) (in French).

15. Bill Of rights of the United States of America (1791). 2019. Available at: https://billofrightsinstitute.org/founding-documents/bill-of-rights/ (Accessed 27.01.2019) (in Russian).

16. The Concordat of 1801. 2019. Available at: https://www.napoleon.org/histoire-des-2-empires/articles/le-concordat-de-1801/ (Accessed 24.01.2019) (in French).

17. Civil constitution of the clergy. Available at: http://www.nogentrev.fr/archives/2016/01/05/33164943.html (Accessed 29.01.2019) (in French).

18. University Charter school is not Russia V. Educational encyclopedia. Vol. 4.: S.- Ka. Moscow, Soviet encyclopedia Publ., 1968. 912 p. (in Russian).

19. Circular on cook's children. 2019. Available at: http://doc.histrf.ru/19/tsirkulyar-o-kukharkinykh-detyakh/. (Accessed 28.01.2019) (in Russian).

20. Law of 9 December 1905 concerning the separation of Churches and State. 2019. Available at: https://www.legifrance.gouv.fr/affichTexte.do?cidTexte=JORFTEXT000000508749 (Accessed 30.01.2019) (in French).

21. Decree of the Council of People's Commissars "On separation of Church from state and school from Church". 2019. Available at: http://constitution.garant.ru/history/act1600-1918/5325/ (Accessed 31.01.2019) (in Russian).

## Информация об авторе

**Пилецкий Виктор Александрович** – доктор исторических наук, заведующий кафедрой гуманитарных дисциплин, Минский инновационный университет (ул. Лазо, 12, 220102, Минск, Республика Беларусь). E-mail: ekonhistbel@mail.ru

## Information about the author

**Victor A. Piletsky** – D. Sc. (Hist.), Head of the Department of Humanities, Minsk Innovative University (12 Lazo Str., Minsk 220102, Belarus). E-mail: ekonhistbel@mail.ru